Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (667), ● ПЯТНІЦА, 21 КРАСАВІКА 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

## ЛЕНІНСКІЯ ЗАПАВЕТЫ

*1. Мацаваць і надалей братні саюз рабочых і сялян.*
*2. Мацаваць і паляпшаць іх уладу — уладу Саветаў.*
*3. Цясней згуртавацца вакол Камуністычнай партыі.*
*4. Быць верным міжнароднаму саюзу працоўных.*
*5. Змагацца супраць цемры, узбройвацца ведамі.*
*6. Агульнымі намаганнямі ўзнімаць гаспадарку краіны.*
*7. Аб'ядноўваць свае дробныя гаспадаркі праз кааперацыю.*
*8. Арганізоўваць усім разам ва ўсім лепшы лад.*
*ЗАЎСЁДЫ ІСЦІ НАПЕРАД,*
*ДА СВЕТЛАГА ЖЫЦЦЯ,*
*ДА САЦЫЯЛІЗМУ, ДА КАМУНІЗМУ!*
*ЗАПАВЕТЫ ЛЕНІНА ВЫКАНАЕМ!*
*1924 год.*

*(З кнігі Н. К. Крупскай «Наш самы лепшы сябра»).*




## *РОЖДАЛОСЬ И СЧАСТЬЕ ПЛАНЕТЫ*

Я не знаю, каким был тот день,
Солнечно-ясным,
А, может, дождливым,
Но верю, он стал для людей
Самым хорошим
И самым счастливым.
Не тем, что апрель
В зелень парки рядил,
Не цветом душистой сирени,
А тем, что в тот день
Был рожден на земле
Владимир Ильич Ленин.
Я верю, что именно с этого дня
Стали ярче сиять рассветы,
Потому что с рожденьем вождя
Рождалось и счастье планеты.
И сколько бы нам не пришлось
прожить
И нашим потомкам тоже,
Но 22-е апреля забыть
Никто никогда не сможет.

**У. МАЛЯЎСКІ,**
**студэнт 1 курса**
**аддзялення журналістыкі.**

## У МУЗЕІ

Звыш 270 памятных мясцін, звязаных з імем У. І. Леніна, знаходзіцца ў Ленінградзе. Нядаўна студэнты нашага універсітэта пабывалі ў некаторых з іх.

На момант застыў уважлівы і задумённы погляд студэнта філалагічнага факультэта Васі Літвінкі, пільна углядваецца ён у дарагія для кожнага з нас рысы вялікага правадыра народаў свету.

Момант выступлення У. І. Леніна па прыезду з-за мяжы на Фінляндскім вакзале увасоблены ў гэтай скульптуры...

Фота А. КАДЗЕТА.



## НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

*Выкладчык нашага універсітэта, Заслужаны урач БССР Іосіф Анісімавіч Кажанкоў—удзельнік V Усерасійскага з'езда Саветаў, на якім выступаў Уладзімір Ільіч Ленін. Наш карэспандэнт В. Комар наведаў удзельніка тых слаўных падзей і пачуў ад яго друкуемы ніжэй расказ.*

Успамінаецца баявы 1918 год. V Усерасійскі з'езд Саветаў, дэлегатам якога пашчаслівілася быць і мне. У зале, акрамя бальшавікоў, былі эсэры, меньшавікі, анархісты, беспартыйныя. Работа з'езда праходзіла ва ўмовах напружанай барацьбы з кіраўнікамі леваэсэраўскай фракцыі з'езда, якія патрабавалі адмены дэкрэтаў аб міры, зямлі, а таксама ліквідавання камітэта сялянскай беднаты, гаворачы іншымі словамі, выступалі за ліквідаванне Савецкай улады.

Але вось раптам зала ўмомант сціхла. Усе уважліва глядзяць на трыбуну. Радасныя твары, усмешкі. Раздаюцца словы: «Ленін! Ленін»...

...З юначых гадоў Уладзімір Ільіч поўнасцю пасвяціў сябе барацьбе за шчасце прыгнечаных і усё сваё вялікае жыццё правёў у барацьбе супраць царскага самадзяржаўя, супроць капіталізма, за вызваленне працоўных ад эксплуатацыі і жабрацтва.

Ленін — заснавальнік Камуністычнай партыі, арганізатар і кіраўнік першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Ён валодаў жалезнай воляй, кіпучай энергіяй і разам з тым быў самы чалавечны чалавек, сціплы, просты, самы сардэчны. Велічнасць Леніна не толькі ў тым, што ён творча развіў вучэнне Маркса і Энгельса ў новых умовах, але і ў тым, што злучыў рэвалюцыйную тэорыю з практыкай барацьбы рабочага класа і смела павёў у бой за новае жыццё, імя якому камунізм.

У свядомасць простых людзей усяго свету У. І. Ленін увайшоў як геніяльны тэарэтык навуковага камунізма, як правадыр рабочага класа і сусветнага камуністычнага руху, як мудры дзяржаўны дзеяч...

Выступаючы на з'ездзе, У. І. Ленін ясна і проста гаварыў аб чарговых задачах міжнароднай і унутранай палітыкі Савецкай улады, і самыя складаныя пытанні для нас, дэлегатаў, станавіліся зразумелымі. Ленін гаварыў: «Злачынным спробам леваэсэраўскіх лідэраў павінен быць дан належны адпор. Масавым тэрорам павінен адказаць рэвалюцыйны пралетарыят на спробы звергнуць Савецкую уладу».

У адносінах Брэсцкага міру Уладзімір Ільіч адзначыў: «Хто цяпер прама ці ўскосна, адкрыта ці прыкрыта гаворыць аб вайне, той крычыць супраць брэсцкай пятлі, той не бачыць, што пятлю на шыю рабочых і сялян у Расіі накідваюць гаспада Керанскі і памешчыкі, капіталісты і кулакі».

Ленін верыў у непераможную сілу рабочага класа ў саюзе з бяднейшым сялянствам.

Пераадольваючы разруху, знешнюю і унутраную контррэвалюцыю, ідуць наперад вялізнымі крокамі, выконваючы ленінскія запаветы, савецкі народ і народы сацыялістычных краін. Расце і памнажаецца ленінская сям'я. Навука, тэхніка, усе веды і дасягненні пастаўлены на службу савецкім людзям. Памнажаюцца гарады, заводы, фабрыкі, квітнеюць калгасныя і саўгасныя палеткі, сады, лугі. Як багатыр, з кожным годам мужнее савецкая краіна. Сотні тысяч школ, інстытутаў, універсітэтаў. Сотні тысяч інжынераў, дактароў, настаўнікаў. Як вырасла і ўзмацнела наша дзяржава! І кожным новым дасягненнем, кожнай шчаслівай часінай мы, як нікому, павінны Вялікаму Леніну.

**І. А. КАЖАНКОЎ,**
**член КПСС з 1917 г.**

# ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Заўтра спаўняецца 97 год з дня нараджэння дарагога для кожнага з нас чалавека — Уладзіміра Ільіча Леніна. Напярэдадні да гэтай падзеі ва універсітэце разгарнулася вялікая падрыхтоўка. У яе ўключыліся камуністы, камсамольцы, грамадскія арганізацыі. Па-рознаму, непаўторна і ўрачыста сустракаюць гэты дзень прафесары, выкладчыкі, студэнты. Адбыліся цікавыя тэматычныя вечары, традыцыйныя сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі — аўтарамі аповесцей, апавяданняў, вершаў аб правадыру. На кожным факультэце праведзены гутаркі са старэйшымі камуністамі, удзельнікамі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Так, на філфаку пазаўчора перад сабраўшыміся студэнтамі ў актавай зале выступіў член КПСС з 1917 года В. С. Пыжыкаў, які неаднаразова меў шчасце асабіста сустракацца з Ільічом. Ён расказаў шмат цікавых эпізодаў з гэтых сустрэч.

Прайшлі на факультэтах таксама і навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя пытанням неабходнасці глыбокага авалодвання спадчынай Ільіча. На іх студэнтамі было праслухана многа дакладаў, розных каштоўных выказванняў і рэкамендацый, як лепш вывучаць тую ці іншую першакрыніцу Леніна. На юрыдычным факультэце, напрыклад, вялася цікавая дыскусія на тэму: «Практыка Леніна як юрыста».

Выйшлі свежыя насценгазеты, усе яны прысвечаны 97-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Тэматычныя нумары багата ілюстраваны, на іх старонках — цікавыя артыкулы камуністаў, якія бачылі Ільіча.

У інтэрнатах, ленпакоях, бібліятэках створаны выдатныя стэнды: «Студэнцкія гады У. І. Леніна», «Вобраз Леніна ў беларускай літаратуры», «Назаўжды ва ўсім з Ільічом» і іншыя.



*У судэнтаў-выпускнікоў нашага універсітэта ў гэтыя дні двайная радасць: светказанне 97-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна ў іх супала з абаронай дыпломных работ. Кожны імкнецца паказаць свае глыбокія веды, даказаць, што ён добрасумленна выконвае ленінскія запаветы «вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца», каб стаць актыўным будаўніком камуністычнага грамадства, для наближэння якога Уладзімер Ільіч Ленін аддаў усё сваё жыццё.*

*На здымку: дыпламантка хімічнага факультэта Аня Міхаенкіна.*

*Фота І. Аскіркі.*

# БУДЗІЦЬ ПАМЯЦЬ

ПОЗНІ ЧАС. Сціх шматгалосы шум у калідорах і вестыбюлі нашага універсітэта. Цяпер можна пасядзець каля прыадкрытага акна, паглядзець на плошчу і спакойна, эпізод за эпізодам перабраць мінулае: часы цяжкай маладосці, грозныя падзеі 1917 года, памятныя сустрэчы з Уладзімірам Ільічом Леніным.

У Міхаіла Мікалаевіча Клімко, выкладчыка БДУ, маладосць, — расказвае ён,—звяздою пад праменні праляцела. Незаўважаў яе. Цяпер мінулае ён больш перажывае, чым тады...

*ТАК БЫЛО*

Уздзеньшчына... Вёска Боркі, родны край Клімко. Вакол пяскі, ды дробны хвойнік. Худзенькія, хілыя каласкі ледзь-ледзь устойвалі да пачатку жніва. Вельмі хацелася есці, хлеба. Маленькі Міша тады бачыў паміраўшую ад голаду сяброўку, штодзённыя слёзы маці, як часта білі яго бацьку. Насіў—лапці, палатняную кашулю, торбу, світку. Купляў — нічога. Рабіў: у шэсць гадоў пасвіў статак у сотню кароў, вартаваў лес пана Радзівіла і хадзіў за сахою, малаціў доўгім цапом жыта. Хацелася: наесціся ўдоваль, умець чытаць, каб нагайкамі не білі яго бацьку, людзей. Чуў: у Петраградзе растралялі рабочых, якія ішлі прасіць да цара хлеба, батракі ў Віцебскай губерні паўсталі і спалілі панскі маёнтак, незнаёмыя словы «Саветы», «Рэвалюцыя». Такім было дзяцінства ў Міхаіла Мікалаевіча. Калі падрос, забралі на службу ў царскую армію.

*ПАЧАТАК...*

Радавы салдат царскай арміі Клімко сваю службу пачаў у Маскве. Памятаецца зімовы час 1905 года. У розных кутках краіны ўспыхнулі паўстанні рабочых і сялян. Аднойчы па загаду цара эскадрон, у якім служыў М. Клімко, накіравалі «уціхамірваць» паўстаўшых сялян у Смаленскую губерню. Каля адной з вёсак акружылі паўстаўшых. Абарваныя і галодныя яны прасілі хлеба. А тут:

— Шаблі к бою! Сячы!— падалася каманда.

Грознаю шарэнгаю, выхапіўшы «селядцы», якія бліснулі на момант сваёй вастрыней на сонцы, коннікі хлынулі на людзей. Нястрымны конь Клімко рвануўся наперад, але яго шабля была ў ножнах. Бачыць, як перад вачамі бліскаюць шаблі яго вайскоўцаў, як падаюць бездапаможныя людзі.

— Стой, загубцы, стой,— вырвалася з грудзей Міхаіла.

Выскачыўшы наперад, ён адрэзаў шлях камандзіру эскадрона.

— Сваіх, значыць... А вы, салдатня, сечаце братоў, сясцёр, маці?..

Хтосьці парнуў Клімко шабляй.

— Станавіся! — грымнула каманда...

Выхапіўшы шаблю, камандзір эскадрона праскакаў ад аднаго фланга да другога і павярнуў каня назад. Эскадрон рыссю вяртаўся ў казарму. Побач з камандзірам ехаў радавы Клімко.

*У ШПІТАЛІ...*

Размяшчаўся ён у Строганаўскім вучылішчы. Тройчы лячыўся Міхаіл Мікалаевіч у гэтым шпіталі. Тут ён сустракаў лютаўскую рэвалюцыю.

Праз вокны было бачна, як па вуліцах ішлі дэманстранты. Клімко і яго сябрам хацелася быць сярод іх, падтрымаць барацьбітоў. У прыадчыненае акно вывесілі кавалак чырвонага палотнішча. І сталі спяваць песню дэманстрантаў. У гэты момант у палату ўварваўся палкоўнік шпіталя.

— Маўчаць! Саветы!.. Выхапіўшы рэвальвер, ён кінуўся на Клімко, які размахваў чырвоным палотнішчам. Усе, нібы згаварыўшыся, схапілі палкоўніка і выкінулі ў акно...

Знізу раздалося грамавое «Ура!»

Плюючы на труп царскага афіцэра, праходзілі дэманстранты. А ў акне шпіталя трапятала кумачовае чырвонае палотнішча...

*У АТАКУ, МІША!*

Памятаецца адзін з тых дзесяці дзён, якія страсянулі свет.

...Раніца 27 кастрычніка. Чуваць выбухі ў розных раёнах Масквы. Вось па Садовай і Самацёчнай плошчах едуць грузавікі з чырвонаармейцамі, на Мяшчанскай — акопы і барыкады. Па Тверскаму бульвару, Сталешнікавым завулку да Крамля падыходзяць атрады рэвалюцыйных байцоў 85, 192, 55-га пяхотных палкоў і артылерысты з Хадынкі.

Чырвонаармейская дружына, у якой быў Міхаіл Мікалаевіч, да гэтага часу з цяжкімі баямі адваявала вуліцы Вялікая і Малая Дзмітраўка, Каляева, з песняю: «Смела, таварышы, у ногу!» выбілі юнкераў са Страснога манастыра і гасцініцы «Метраполь», вызвалілі палітычных зняволеных з Бутырскай турмы. Наперадзе — штурм Крамля, дзе заселі юнкеры і белагвардзейцы. Адтуль стралялі з кулямётаў. Атакі чырвонагвардзейцаў на Крэмль перарываліся шалёным агнём юнкераў. Чакалі. Добра перагрупаваўшы свае сілы, Клімко і яго таварышы кінуліся да Мікіцкіх варот. Кулямётны агонь юнкераў асадзіў назад. У гэты момант цяжкая артылерыя камандзіра Дзямідава пачала стральбу па Крамлі. Спалоханыя юнкеры спынілі агонь. У шырока раскрытыя вароты на тэрыторыю Крамля ўварваліся чырвонагвардзейцы. Над Домам Саюзаў—чырвоны сцяг... Ляцяць угору шапкі, моцныя абдымкі, радасць. Нехта крычыць:

# ЯГО ІМЯ—У СЭРЦЫ КОЖНАГА

— **МНЕ ЎСПАМІНАЕЦЦА** адзін эпізод з майго дзяцінства. Аднойчы ноччу, адпачываючы ў двары нашага дома, пры святле месяца, я запытаў у маіх бацькоў: «Хто такі Ленін?» Бацька мой, паказваючы рукой, казаў мне: «Вунь, глядзі: самая светлая зорка ў небе — гэта Ленін!» А неўзабаве, калі я пайшоў у школу, дык там і даведаўся, што Ленін — гэта самы звычайны, самы просты і чалавечны чалавек, які тым і адрозніваўся, што быў вельмі мудрым, мог прадбачыць усё напярод. Гэта вялікі правадыр працоўных усяго свету. І вось тады я яшчэ лепш пачаў разумець свайго бацьку.

Гэтак аднойчы пачаў свой расказ в'етнамскі студэнт падрыхтоўчага факультэта універсітэта Нгуен Ван Шы.

А яго сябра Нгуен Фыок Лан, што прыехаў разам з ім на вучобу ў Мінск, напісаў у факультэцкую насценгазету «Дружба»:

— Ленін жыве ў сэрцы кожнага в'етнамца. Добра ведаюць Леніна нашы дзеці. Як толькі ўбачаць яго партрэт, адразу кажуць: «Гэта дзядуля Ленін!»

Так, сення Леніна добра ведаюць і дарослыя і нават малыя на ўсім зямным кантыненце. Ведаюць, бо ён аддаў усе свае сілы, ўсё жыццё справе вызвалення чалавецтва. Рускі і чэх, беларус і паляк, казах і венгр, в'етнамец і кубінец, юнак з далёкай Афрыкі — усе раяцца з ім, як з жывым чалавекам пры вырашэнні кожнага складанага пытання. Што і як зрабіў бы Ленін у тым ці іншым выпадку? — такое пытанне задае сабе кожны юнак і дзяўчына.

І зразумела, чаму бібліятэкар Ірына Міхайлаўна Гурная не затрымалася з адказам на пытанне, як чытаюць Леніна нашы зарубежныя сябры, якія вучацца ва універсітэце.

Шмат твораў і распрацовак па творах У. І. Леніна чытаюць на падрыхтоўчым факультэце в'етнамцы Нгуен Суан Хан, Лыонг Хонг Дык, афрыканцы Жан-Рышар Нгасака, Жан Нгубі, Жан Дзіанкуіка, Самуэль Бвамбі, кубінскія студэнты хімічнага факультэта Барыс Ла Сэрна і Арланда Рэйноса, афрыканец з фізічнага факультэта Джон Флетчар і многія іншыя.

Яны цікавяцца ўсім: як У. І. Ленін падыходзіў да вырашэння пытанняў нацыянальнай палітыкі, як вырашаў ён пытанні вайны і міру, як разглядаў пытанне барацьбы з каланіялізмам і імперыялізмам, як вучыў ён, урэшце, арганізоўваць спаборніцтва, будаваць новае жыццё.

Марсель Элака цікавіцца нават, якую ролю ў грамадстве адводзіў У. І. Ленін друку. А Марсель Кулунамі вельмі зацікавіўся ленінскім планам ГОЭЛРО. Гэтым сёння цікавяцца нездарма: усе забітыя і прыгнечаныя народы растуць, імкнуцца да лепшай долі. Студэнты цікавяцца не проста так: яны хочуць быць не проста спецыялістамі з дыпломам, але і сапраўднымі гаспадарамі свайго лёсу, актыўнымі будаўнікамі новага жыцця ў сваіх краінах. А ў Леніна на ўсё знойдзеш адказ. Таму і песні пра яго складаюцца ўсімі народамі. Складаюцца і пяюцца. Ужо не адзін год упрыгожваюць яны і рэпертуар харавога інтэрнацыянальнага калектыва замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта. Толькі гэтай вясной хор выконваў песні аб Леніне ва універсітэце, у палацы культуры камвольнага камбіната і перад удзельнікамі злёту калектываў і ўдарнікаў камуністычнай працы абутковага вытворчага аб'яднання «Прамень». У гэтых канцэртах прымаў актыўны ўдзел кангалезскі студэнт Андрэ Акугна. Ён чытаў напамяць урывак з выдатнай паэмы У. У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін».

Кафедра рускай мовы падрыхтоўчага факультэта з удзелам замежных студэнтаў прысвяціла цэлы музыкальна-літаратурны мантаж на вечары, прысвечаным У. І. Леніну. Замежныя студэнты расказвалі аб жыцці і дзейнасці вялікага правадыра працоўных, чыталі вершы, спявалі рэвалюцыйныя песні. Група в'етнамскіх студэнтаў падрыхтавала і выканала любімую песню Ільіча «Замучаны цяжкай няволяй».

А колькі фільмаў і дакументальных, і мастацкіх, якія расказваюць аб Леніне, прагледзелі за ўвесь год нашы госці! Тут лепшым падцвярджэннем з'яўляецца іх актыўнае наведванне кінафестываля, што прысвяцілі 50-годдзю Вялікага Кастрычніка і 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і Мінскі гарком ЛКСМБ.

Сустракаліся зарубежныя сябры і са старымі камуністамі, якім давялося бачыць У. І. Леніна.

Многія замежныя студэнты любяць пісаць у сваіх сшытках пра У. І. Леніна. Лепшым і любімым сваім сачыненнем яны лічаць тое, у якім пісалі пра самага чалавечнага чалавека ў свеце.

Ул. ГАЛАЙША.



Памятныя мясціны Леніна...

Яны вабяць кожнага, будзяць у сэрцы успаміны аб перажытым ці прачытаным, зноў і зноў прымушаюць вяртацца да самага дарагога на зямлі імя — Леніна.

Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет, які суправаджаў групу студэнтаў універсітэта ў час паездкі ў Ленінград, сфатаграфаваў балкон былога асабняка Шэсінскай, з якога неаднаразова выступаў У. І. Ленін, і студэнтаў універсітэта ў двары Смольнага.





# МІНУЛАЕ

— Цяпер будзе ў нас хлеб, мір... Са скроні Міхаіла Мікалевіча скацілася крутая сляза.

## ПЕРШАМАЙ 1918-ГА

Уся Чырвоная плошча запоўнена людзьмі. Усе чакаюць У. І. Леніна. І вось адкрываюцца вароты Спаскай вежы. Услед за конным экспертам ехаў У. І. Ленін у суправаджэнні Дзяржынскага, Арджанікідзе і іншых сваіх саратнікаў. Раздалося моцнае «ура»...

Ленін пачаў гаварыць. Было далёка, але некаторыя абрыўкі слоў даносіліся да Клімко. Пасля Ленін перайшоў на другі, трэці, чацвёрты памосты і нарэшце ўзышоў на пяты. Тут яго сустрэлі апладысментамі. Міхаіл Мікалаевіч добра разгледзеў Леніна. Ва Уладзіміра Ільіча быў якісьці натхняючы твар. Позірк Ільіча адлюстроўваў шчасце ўсіх людзей.

Ільіч быў у чорным паліто, з каёмачкай з бархату на варатніку, у касцюме, жылетцы. У правай руцэ трымаў шапку, у левай — крысо жылета і рабіў прамову. Кожнае слова Ленін суправаджаў унушальным узмахам рукі. У прамове Ленін заклікаў мацаваць уладу Саветаў, змагацца за поўную перамогу рэвалюцыі, аднаўляць гаспадарку.

Пасля заканчэння прамовы Ленін паехаў у Крэмль. На плошчы зайграў аркестр. Народ радаваўся. Клімко мучыла думка: «Здавалася, што ён знаходзіцца ў баку ад жыцця, за якое ваяваў». Тут, на плошчы, напісаў заяву ў партыю. Таварышы у казарме прагаласавалі адзінагалосна. Прыняты! У сваім выступленні гаварыў:

— Хачу быць у партыі Леніна. Дзе Ленін, там і перамога...

## А ПАСЛЯ...

Па краіне працягвалася трыумфальнае шэсце Савецкай улады. Міхаіл Мікалаевіч змагаўся з белагвардзейцамі ў Яраслаўі і пад Львовам, вучыўся у школе партыйнай і савецкай работы імя Свярдлова, арганізоўваў і кіраваў першай камунай у Духаўшчыне, што на Смаленшчыне. Там, камунарамі быў выбраны дэлегатам на І Усерасійскі з'езд прадстаўнікоў сельскай гаспадаркі камун, арцелей, работнікаў зямлі і лесу. Там зноў сустрэўся з Леніным.

## ДОБРЫЯ ПАРАДЫ

Каля выхада з Калоннага зала Дома Саветаў сабралася шэсць аднавяскоўцаў: трое без рук і трое без ног. На перапынку Ленін заўважыў іх, ён падышоў, крануў за пусты рукаў Клімко і запытаў вельмі проста і задушэўна.

— Ну як?

Яны ўсе хорам адказалі:

— Нічога, Уладзімір Ільіч, перабудоўваемся...

Ленін абвёў усіх сваім пытлівым поглядам, пасля сказаў:

— Вучыцца патрэбна, патрэбна вучыцца!

Дарагая сустрэча і гэтыя ленінскія словы адкрылі Клімко ясны шлях у жыццё. Пайшоў вучыцца. Скончыў рабфак пры Беларускім універсітэце, сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева, аспірантуру, стаў навуковым супрацоўнікам, дацэнтам. Вучыўся ў Кенігсбергскім універсітэце, Баварскай акадэміі, Вышэйшай сельскагаспадарчай школе ў Берліне. Зараз ён выкладчык БДУ імя. У. І. Леніна.

Перад пачаткам размовы Міхаіл Мікалаевіч у сваім блакноце зрабіў паметку аб планах на заўтра. Ужо так павялося ў яго. Памяць то моцная, але можа падвесці. Радуюся: дажыў да 50-годдзя Савецкай улады. А не спадзяваўся. Было ж у яго такое жыццё, што трашчалі косці, але скура не лопалася. Усё перанёс, усё перамог, усё перажыў.

У позні вечар мы разам з Міхаілам Мікалаевічам Клімко пакідаем універсітэт. Цягне халодным вецярком.

— А як ваша здароўе, Міхаіл Мікалаевіч?

— Хваробы не заўважаю... шкада, што позні час, а то б памерыліся ў кросе...

А. КАДЗЕТ.

# АСАБЛІВЫ ЭКЗАМЕН

Імя беларускага пісьменніка Івана Мележа палюбілася чытачу за выдатныя мастацкія творы, за багаты і шматгранны талент. Асабліва пладавіта працуе празаік у апошнія гады. Нядаўна на кніжных паліцах кнігарань з'явіўся новы твор празаіка «Подых навальніцы», які сведчыць аб тым, што пісьменнік знаходзіцца на творчым узлёце і яшчэ не раз парадуе чытача сваімі цудоўнымі творамі.

Днямі на філалагічным факультэце адбылося абмеркаванне кнігі Івана Мележа «Подых навальніцы». На ім прысутнічаў і сам аўтар. Кожная сустрэча пісьменніка з чытачом, гэта, бадай, асаблівы для яго экзамен, аб'ектыўная адзнака творчасці, мастацкага таленту, тэматыкі... Менавіта, аб гэтым і вялася гаворка беларускім крытыкам, дацэнтам кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта Д. Я. Бугаёвым, які уступным словам адкрыў сустрэчу. Ім, у прыватнасці, было адзначана, што «Подых навальніцы» — выдатны твор, які вызначаецца складанымі псіхалагічнымі назіраннямі, жыццёвай шматграннасцю, дакладнай характарыстыкай персанажаў. У творы сацыяльныя праблемы ставяцца востра, па—майстэрску.

С. А. Гусак адзначыў, што шляхі літаратурнага майстэрства праявіліся ў творах «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», дзе рэалістычнасць, аб'ектыўныя абставіны ломкі жыцця пісьменнікам паказаны глыбока і праўдзіва.

— Іван Мележ стварыў буйныя характары, — гаворыць аспірант кафедры беларускай літаратуры Генадзь Шупенька, — раман вызначаецца сваёй эмацыянальнасцю, глыбінёй пачуццяў. Пісьменнік умее ададкрываць думкі сваіх персанажаў. Раман мае вялікае пазнавальнае значэнне для моладзі.

Студэнт трэцяга курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Сяргей Законнікаў спыніў увагу прысутных на шматгранных нацыянальных рысах твора, на вялікіх дыялекталагічных сродках мовы герояў.

— Для мяне, — сказала студэнтка фізічнага факультэта Лена Глушакова, — творы Івана Мележа «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» маюць вялікае пазнавальнае значэнне. Я вырасла ў горадзе. І да таго, як прачытала творы пісьменніка, смутна ўяўляла жыццё сялян Палесся ў тыя далёкія часы. Раман я чытала з вялікім задавальненнем і цікавасцю...

Выступіўшыя выкладчыкі, студэнты (усяго каля дваццаці чалавек) далі высокую ацэнку літаратурнай дзейнасці Івана Мележа, выказвалі шчырую падзяку за выдатныя творы, за іх рэалістычнасць і мастацкую арыгінальнасць.

Пасля цёпла сустрэты прысутнымі выступіў празаік. Ён адказаў на шматлікія пытанні, падзяліўся творчымі планамі на будучае.

На здымку: (злева направа) аспірант Г. Шупенька, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Д. Я. Бугаёў, пісьменнік Іван Мележ, прафесар М. Р. Ларчанка.

Тэкст Г. Мацука, фота І. Аскіркі.



# У ПРАЦЫ І БАРАЦЬБЕ

*18 красавіка 1921 года ЦВК БССР прыняў рашэнне адкрыць рабочы факультэт, факультэт грамадскіх навук і медыцынскі факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 22 красавіка ўся наша краіна адзначае Дзень нараджэння У. І. Леніна, чыё імя з 1949 года носіць наш універсітэт. Ніжэй мы друкуем матэрыял аб гісторыі універсітэта, прысвечаны 46 гадавіне з дня падпісання дэкрэта аб адкрыцці буйнейшай навучальнай установы Беларусі і ленінскаму юбілею.*

**Стварэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта звязана з імем У. І. Леніна. У дэкрэце Саўнаркома РСФСР, падпісаным У. І. Леніным 30 студзеня 1919 года, гаворыцца: «У азнаменаванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, якая разняволіла працоўныя масы ад эканамічнага, палітычнага і духоўнага гнёту з боку маёмасных класаў і адкрыўшай ім шырокія шляхі да крыніц ведаў і культуры, заснаваць дзяржаўныя універсітэты...»**

**У адпаведнасці з ленінскім дэкрэтам ЦВК БССР 24 лютага 1919 года, менш чым праз два месяцы пасля абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, прыняў пастанову аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэтай жа пастановай, нягледзячы на цяжкі час, які перажывала маладая краіна Саветаў, на арганізацыю універсітэта быў выдзелен 1 мільён рублёў з фонду рэспублікі. Дадатковыя сродкі былі выдзелены Наркамправасам РСФСР. Ажыццявіць гэтую задуму не удалося. У красавіку 1919 белапалякі пачалі наступленне на Беларусь, а ў пачатку жніўня акупіравалі Мінск.**

**У студзені 1920 года у Мінск прыехала група членаў Маскоўскай камісіі для арганізацыі універсітэта. Яшчэ раней была створана Мінская камісія. Да пачатку жніўня 1921 года абедзве камісіі закончылі сваю работу, а 18 красавіка 1921 года ЦВК БССР прыняў рашэнне адкрыць ва універсітэце у першую чаргу рабфак, факультэт грамадскіх навук і медыцынскі факультэт. Пры гэтым было адзначана, што адкрыццё універсітэта з'яўляецца тэрміновай і нечарговай задачай вялікай палітычнай важнасці. У маі 1921 года быў аб'яўлен першы прыём на рабочы факультэт.**

**31 красавіка 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё універсітэта. 1 лістапада 1921 года былі праведзены заняткі на медыцынскім факультэце і факультэце грамадскіх навук. Заняткі на рабфаку пачаліся раней.**

**У першым навучальным годзе ва універсітэце займалася 1 390 студэнтаў, працаваў 81 выкладчык, у іх ліку 14 прафесараў.**

**Адкрыццё універсітэта супала з цяжкім і складаным перыядам, які прышлося перажыць маладой рэспублікі Саветаў. Вось як характарызаваў гэты час першы рэктар БДУ У. І. Пічэта ў часопісе «Маладняк» у артыкуле «Год работы Белдзяржуніверсітэта»: «Заняткі ў мінулым годзе вяліся ў асабліва цяжкіх умовах, пры тэмпературы ніжэй нуля, пры адсутнасці у лабараторыях вады, і толькі гераічнае напружанне прафесараў і лектараў універсітэта, падтрыманае энтузіязмам моладзі, дало магчымасць правесці навучальны год без асабліва зацяжных перапынкаў».**

**У 1928 годзе было распачата будаўніцтва універсітэцкага гарадка, якое ў асноўным завяршылася да 1930 года.**

**Вырашэнне задач культурнай рэвалюцыі, развіццё школ і навучальных устаноў патрабавала паскарэння падрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў і другой катэгорыі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. У 1931 годзе на базе педфака БДУ быў створан Вышэйшы педагагічны інстытут імя А. М. Горкага і некалькі эканамічных вну: фінансава-эканамічны, планава-эканамічны, савецкага будаўніцтва і права. У складзе універсітэта заставаліся два аддзяленні: фізіка-матэматычнае і прыродазнаўчае. У 1934 годзе пасля рашэння ЦК УКП(б) і СНК СССР «Аб выкладанні гісторыі і геаграфіі ў сярэдняй школе» ва універсітэце ствараюцца гістарычны і геаграфічны факультэты.**

**Статыстыка сведчыць, што за 20 даваенных гадоў свайго існавання універсітэт даў краіне 5 240 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.**

**У першыя дні вайны тысячы студэнтаў, выкладчыкаў вну рэспублікі з'явіліся добраахвотнікамі на зборныя пункты, каб стаць на абарону Радзімы. Сярод іх было 450 выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Многія загінулі смерцю мужных. Астатнія дайшлі з перамогай да Берліна. Вучоныя БДУ не далічылі ў сваіх радах дацэнтаў І. Ф. Лочмеля, Н. В. Рыбакова, В. А. Нісевіча. Сярод герояў беларускіх партызан добра вядома імя выхаванца БДУ Героя Савецкага Саюза В. А. Парахневіча. З акупіраванага Мінска ў партызанскі атрад быў нелегальна пераpraўлен акадэмік Н. М. Нікольскі, прафесары А. А. Краўцоў і І. А. Ветохін. Зроблена гэта было пры дапамозе мінскай падпольшчыцы, таксама выхаванкі БДУ М. Ф. Малаковіч.**

**У канцы 1942 года, як толькі былі вызвалены першыя метры беларускай зямлі, з радоў Савецкай Арміі адзываецца група работнікаў вну, якім была даручана распрацоўка мерапрыемстваў па узнаўленню БДУ і іншых вну рэспублікі. Дапамагаюць ім у гэтым Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава, работнікі Маскоўскага гарадскога Савета і група работнікаў Камітэта вышэйшай школы пры Саўнаркоме СССР на чале з прафесарам Д. А. Троіцкім. Кіравала ўсёй гэтай работай намеснік старшыні Саўнаркома СССР Разалія Самойлаўна Землячка.**

**15 мая 1943 года прымаецца Пастанова Саўнаркома СССР «Аб узнаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Частка факультэтаў была размешчана ў МДУ, а асноўная частка на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі. 11 кастрычніка 1943 года афіцыйна пачаліся заняткі ва універсітэце. У першыя дні заняткаў было 350 — 380 студэнтаў, а ўжо да пачатку снежня — 582 студэнты і 90 выкладчыкаў. З партызанскіх атрадаў і з іншых вну прыйшлі ва універсітэт акадэмік Н. М. Нікольскі, прафесары І. А. Ветохін, Н. А. Прыляжаеў. У жніўні 1944 года універсітэт пераехаў у Мінск. Пачаўся працоўны ўзнаўленчы перыяд у жыцці рэспублікі. Падымаўся і вырастаў з руін Беларускі дзяржаўны універсітэт, ні на мінуту не спыняючы навучальнага працэсу.**

**У 1949 годзе ў жыцці універсітэта адбылася важнейшая падзея. У сувязі з 30-годдзем утварэння БССР Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту было прысвоена імя Вялікага Леніна, а ў студзені гэтага года за высокія заслугі перад Радзімай ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.**

**Сёння Беларускі ардэнаносны універсітэт імя У. І. Леніна з'яўляецца флагманам беларускай навукі. Ва універсітэце праводзяцца даследаванні па ядзернай фізіцы, паўправадніках, вылічальнай матэматыцы, фізіцы і хіміі палімераў, фотасінтэзу, па методыцы спектральнага аналізу рэчываў, сучасных праблемах матэматыкі, філалогіі і юрыдычных навук і г. д. Кафедры грамадскіх навук сістэматычна прыцягваюць студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, прывіваюць ім навыкі прапагандысцкай і агітатарскай работы. Студэнты універсітэта ўдзельнічаюць у будаўніцтве вучэбных карпусоў, майстэрняў і лабараторый, стадыёна і азеляненні горада і універсітэцкага гарадка, сістэматычна праводзяць свой працоўны семестр на будоўлях Беларусі і далёкага цалиннага краю. Вялікае месца ўдзяляецца сустрэчам студэнтаў універсітэта з моладдзю зарубежных краін. Цяпер ва універсітэце займаюцца студэнты з 16 краін свету.**

**Камсамольская арганізацыя універсітэта налічвае каля шасці тысяч членаў. Цяпер у сценах БДУ на дзевяці факультэтах і завочным аддзяленні навучаецца каля 14 тысяч чалавек, або ў дзесяць разоў больш, чым у 1921 годзе.**

**З года ў год пашыраецца навуковая база універсітэта. За апошнія гады адкрыта некалькі новых аддзяленняў і факультэтаў. У юбілейным годзе пачне сваю работу факультэт журналістыкі.**

**Вялікая і слаўная гісторыя нашага універсітэта, які носіць імя Вялікага Леніна. Многа карысных і добрых спраў зрабіў ён для рэспублікі і ўсёй краіны. Наш доўг — ведаць яго гісторыю і памнажаць славу.**

**А. ЯРОХІН.**

